**Шатыронак, Ірына. Дзве тэлефанаграмы: [артыкул пра падарожжа па Навагрудчыне і аповедам пра вынікі гістарычнага пошуку матэрыялу для новага твора – кнігі *«Хроніка адной архіўнай папкі»*] // Звязда.- [http://zviazda.by/2014/12/62981.html.-](http://zviazda.by/2014/12/62981.html.-) 03.12.2014.**

# Дзве тэлефанаграмы



03.12.2014

**…Калі едзеш па навагрудскай зямлі, то звяртаеш увагу на шчыльнасць забудовы старых вёсак: дамкі лепяцца, цiснуцца адзiн да аднаго, праз платы зазiраюць на вузкiя надзелы зямлi, фасадам амаль упiраюцца ў асфальт дарогi. Зямлi iм мала?**

**Так, у 20–30-я гады мiнулага стагоддзя, калi вёскi забудоўвалiся, сапраўды было мала. Гэта тэрыторыя Заходняй Беларусi. На пытанне, чаму так блiзка стаяць дамы, тут адкажуць проста: «Пры паляках зямля каштавала дорага, жылi бедна». Такiх малазямельных «беднякоў» у той час была большасць.**

**На гэты раз выбрала свой гiстарычны маршрут Навагрудак — Валеўка — Пуцэвiчы — Гарадзечна. Хачу рэстаўраваць адну гiсторыю, звязаную з канкрэтнымi людзьмi, якiя жылi «за польскiм часам». Без прывязкi да мясцовасцi не абысцiся… I людзi, якiх даўно няма, нiбы вярнулiся з небыцця, каб расказаць пра падзеi амаль 90-гадовай даўнасцi.**

Мiкалай Будаль быў арыштаваны польскiмi ўладамi ў студзенi 1927 года, знаходзiўся з групай навагрудскiх падпольшчыкаў — членаў КПЗБ i «Грамады» — у мясцовай турме. Будынак турмы захаваўся, гэта цагляны трохпавярховы будынак, што знаходзiцца ў двары Навагрудскага АУС i патрабуе рамонту. На сцяне таблiчка «Помнiк архiтэктуры. Ахоўваецца законам».

Першапачатковы спiс — 75 чалавек арыштаваных, да суда ў канцы года дойдзе ўжо 25. Астатнiя, у залежнасцi ад цяжару злачынстваў, будуць вылучаны ў некалькi груп; некага адсеюць, за непаўналетнiх бацькi заплацяць буйныя штрафы, траiх суд апраўдае.

Падследных членаў КПЗБ i «Грамады» дапытваюць кожны дзень: складаюцца пратаколы, выклiкаюцца сведкi, вядуцца крыжаваныя допыты, iх фатаграфуюць, здымаюць адбiткi пальцаў, заводзяць на кожнага справу i сакрэтныя дэпешы з грыфам «Pilnie» адпраўляюць у Варшаву. У Гродзенскiм абласным архiве мне трапiлiся дзве рукапiсныя тэлефанаграмы са штампамi павятовай камендатуры. Першая тэлефанаграма № 472 датуецца 16 красавiка 1927 года, адпраўлена ў дзве гадзiны дня ва ўсе палiцэйскiя ўчасткi Навагрудскага ваяводства. У той дзень была субота.

У тэлефанаграме паведамлялася: «Арыштаваны Будаль Мiкалай, сын Канстанцiна i Аляксандры, дваццацi чатырох гадоў, якi абвiнавачваецца па 129-м ар-

тыкуле Крымінальнага кодэкса II Рэчы Паспалітай, знаходзячыся на лячэнні ў Навагрудскім турэмным шпіталі, збег з-пад арышту…».

Мікалай на волі, напэўна, ён рыхтаваўся да ўцёку, прыглядаўся, усё разлічыў. Турэмны шпіталь усё ж такі не турма. Як малады чалавек, здаровы, поўны сіл і энергіі, трапіў у турэмны шпіталь?

У турме Мікалай першы раз закурыў. Таварыш па падполлі, Косця Юрыс з суседняй вёскі Вялікая Орбіна, падзяліўся тытунём. З непрывычкі моцны дым выядаў горла, гарэла ў грудзях, хлопец задыхаўся, моцна адкашліваўся, але потым прывык, зацяжкі стаў рабіць эканомныя, глыбокія.

Перадачы ў турму дазвалялі прыносіць раз у месяц. З Ярэмічаў прыязджала маладая жонка дзядзькі Яўгена Емяльянавіча Будаля, роднага брата бацькі. Ах, гэтая Шура, вясёлая пявуння Шурачка! Якая яна яму цётка? Мікалай старэйшы на пару гадоў. У 1927 годзе ёй споўнілася толькі 22 гады, а ў яе ўжо двое дзяцей (старэйшую дачку Жэню нарадзіла ў сямнаццаць).

Дзядзька вярнуўся дадому з імперыялістычнай ці, як тады яшчэ называлі, «з еўрапейскай вайны» ў 1921 годзе, паранены, змучаны, перахварэўшы на тыф, без веры і здароўя. Юная Шурачка Бразоўская ўразіла баявога штабс-капітана прыгажосцю і вытанчанымі манерамі, яна спявала чыстым голасам рамансы і сама сабе акампаніравала на гітары. Амаль не раздумваючы, Яўген Будаль ажаніўся з дзяўчынай, малодшай за яго на трынаццаць гадоў.

Незадоўга да вайны 1914 года бацька Шурачкі Бразоўскай адвёз яе ў чужы і халодны Пецярбург, аддаў у вучылішча імя Вялікай княгіні Вольгі Раманавай. На поўны пансіён. Зноў напрошваецца пытанне — як? У сям'і расказвалі — была пратэкцыя, як жа без яе. Брат бабулі Алесь Кавалеўскі служыў пры двары Мікалая II. Эканомам, пісарам ці стаяў пры якой іншай пасадзе, цяпер ужо немагчыма даведацца. Меў прыгожы почырк, так і зрабіў кар'еру. Але для мястэчка Ярэмічы любы, самы найніжэйшы чын у Пецярбургу аўтаматычна ператвараецца ў недасягальна высокую пасаду, абрастаючы неверагоднымі падрабязнасцямі і чуткамі, так што Кавалеўскі ў вачах землякоў даўно стаў амаль легендарнай асобай.

Але ўсё пайшло прахам, як толькі ў пачатку 1917 года падзьмулі рэвалюцыйныя ветры. У далёкім Пецярбургу пачаліся хваляванні, наступілі занадта трывожныя часы. Па Шурачку і яе сястру неадкладна прыехаў бацька і забраў дачок ад граху далей у родныя Ярэмічы.

Шурачка вярнулася пад бацькаў дах з добра вымуштраванымі манерамі, яна ўмела трохі какетнічаць, насіла капялюшыкі, шаўковыя панчохі. Ведала, дзе трэба прамаўчаць або расказаць цікавы эпізод са сталічнага жыцця і наогул, як падаць сябе ў найлепшым выглядзе. Але галоўнай яе каштоўнасцю быў тоўсты сшытак, у ім захоўвалася мноства дзіўных рэцэптаў, у тым ліку рэцэпты незабыўнай немкі фройлен Эльзы — яе фірмавыя баварскія крэндзелькі, яблычны штрудзель, бігас з капустай, качка з яблыкамі, хатняга прыгатавання сыр і шмат чаго незвычайнага.

Нават рабініха Гутка, што жыла пры драўлянай сінагозе, гандлявала ў Ярэмічах дражджамі ва ўласнай краме, не ведала тых цудоўных рэцэптаў. А яна так зазывала Шурачку да сябе, так прасіла, прапаноўвала добрыя зніжкі на свой тавар, толькі б перапісаць з запаветнага сшытка царскія рэцэпты. Але Аляксандра Будаль славілася ў Ярэмічах лепшай кулінаркай, свята ахоўвала свае рэцэпты як тайну за сямю пячаткамі.

…Вось і сёння Мікалай чакаў перадачу ад Шурачкі. Яна прыгожа клала ў чысты палатняны мяшэчак сваю выпечку, кавалачак карычневага салодкага мядовіка, хатнія каўбасу, сыр і пакецік свежавысушанага тытуню. Шурачка была вялікая выдумшчыца, мінулы раз паклала некалькі хваёвых галінак — востра запахла лесам, бурштынавай жывіцай, успомніўся лес за Нёманам, палянка, дзе моладзь збірала-

ся пад выглядам вясёлай гулянкі (ладзілі танцы, а самі чыталі газеты з Мінска, падручнікі, часопісы, забароненую літаратуру).

Адна мясцовая жыхарка, настаўніца Ганна Уладзіміраўна Бандарык з Ярэміч, расказала мне, што ў 2005 годзе Шурачка Бразоўская прыязджала — праз 60 гадоў! — звалілася як снег на галаву.

— З Сібіры: там яе сям'я, дзеці, унукі. Якая была сустрэча!

Лёс яе бацькі Аляксандра Феафонавіча Бразоўскага складзецца таксама трагічна. Ён і яго родны брат Мікалай пяройдуць мяжу, трапяць у БССР, ну а далей усё вядома: арышт, прысуд «тройкі», расстрэл.

…Сярэдзіна красавіка, у вільготным цёплым паветры разліта прадчуванне вясны, кахання, хуткага цвіцення. Другая тэлефанаграма, № 478, запоўнена ўручную на тыпавым фірменным бланку ад 17 красавіка 1927 года, 7 гадзін раніцы 15 хвілін: «Услед за папярэдняй тэлефанаграмай № 472 ад 16.04.1927 г. даю справаздачу, што Будаль Мікалай 16.04.1927 г. дастаўлены ў Пуцевічы з пастарунка Гарадзечна».

Справаводства польскай канцылярыі працавала спраўна, усе дакументы запратакаліраваны і падшыты. Дзякуючы ім мы даведаліся пра невядомыя старонкі з жыцця зняволенага Навагрудскай турмы Мікалая Будаля, студэнта-медыка апошняга курса. Уцёкі не адбыліся, дакладней, яны былі няўдалымі: на волі Мікалай пабыў усяго паўдня — 16 красавіка, ноч і раніцу. 17 красавіка была нядзеля. Чаму ён рухаўся ад Навагрудка ў бок Пуцевіч, а не ў бок Карэліч, да Ярэміч, — невядома. Магчыма, кірунак у бок Пуцевіч у 20-я гады быў малалюдным, не такім шчыльна заселеным, як у родных Ярэмічах.

Акрамя пратаколаў допытаў арыштаваных Навагрудскага падполля выявіла «Журнал рэгістрацыі прыбыцця і выбыцця зняволеных з 01.01.1928 па 31.05.1028 гг. Гродзенскай карна-следчай турмы». Да 1929 года ў турэмным журнале адзначаліся такія графы, як тэрміны адбыцця пакарання, веравызнанне (каталікі, праваслаўныя, іўдзеі і інш.), нацыянальнасць зняволеных (палякі, беларусы, літоўцы, рускія і інш.), у 1929 годзе супраць прозвішча «Budol» ужо значылася «палітычны».

Журнал дапамог мне скласці кароткую храналогію турэмных перамяшчэнняў Мікалая, атрымалася своеасаблівая «геаграфія». 8 студзеня 1927 года — арышт у Ярэмічах, Навагрудская турма. 16 красавіка 1927 года — уцёкі з Навагрудскага турэмнага шпіталя. 17 красавіка 1927 года Мікалай схоплены ў мястэчку Пуцевічы і дастаўлены ў пастарунак Гарадзечна Навагрудскага павета. 21 снежня 1927 года суд вынес прыгавор Мікалаю Будалю і 24 арыштаваным падследным. У дакументах гэтая справа вылучана як «Справа «Канстанціна Юрыса» і іншых падследных». 5 студзеня 1929 года Мікалай Будаль прыбывае з Вільні, турмы на Лукішках, у Гродзенскую перасыльную следча-карную турму. 23 сакавіка 1929 года ў журнале рэгістрацыі прыбыцця і выбыцця зняволеных ёсць запіс на старонцы «Выбыў» — Мікалай Будаль у Равічы. Калі Мікалай прыбыў у Гродзенскую турму з Вільні, ёсць усе падставы лічыць, што ён адбыў увесь 1928 год у Вільні.

Дарэчы, у турме ў Равічах да 1939 года адбывалі тэрмін С. Прытыцкі, У. Царук, П. Жалезняковіч. 21 снежня 1927 года быў абвешчаны прысуд 25 арыштаваным Навагрудскага падполля, членам КПЗБ і «Грамады». Трое з іх — Браніслаў Змачынскі, Баляслаў Янкоўскі і Сяргей Багейла — прызнаны невінаватымі.

Звярнула ўвагу, што ў пратаколе ўсіх перакрыжаваных допытаў польскай пракуратурай і паліцыі побач з прозвішчам М. Будаль пастаянна праходзяць прозвішчы будучага Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Царука, будучага старшыні Карэліцкага выканкама Паўла Жалезняковіча, Клаўдзіі Гацько, Аляксандра Бразоўскага і іншых…

У мяне сабралася дастаткова архіўных дакументаў, запісаў, сведчанняў, пісьмаў, якія апрацоўваю пасля сустрэч з захавальнікамі «жывой гісторыі» Навагрудскага і Карэліцкага раёнаў. Хочацца спадзявацца, яны папоўняць «белыя плямы» нашай айчыннай гісторыі…

**Ірына ШАТЫРОНАК,** *г. Гродна*

***Пра жыццё Заходняй Беларусі паміж дзвюма сусветнымі войнамі напісана нямала. Гісторыя «крэсаў усходніх», лёс іх жыхароў турбуе і сённяшніх аўтараў. Ірына Шатыронак, пісьменніца з Гродна, таксама цікавіцца гэтай праблематыкай. Вывучае архіўныя дакументы, падарожнічае па Беларусі ў пошуку цікавых аповедаў, магчымых сведак тых падзей. Дакументы і сведчанні становяцца асновай аповесці, работа над якой працягваецца. Назвала яе аўтарка — «Хроніка адной архіўнай папкі».***